**Міхалевіч, Н.** Абпалены вайною лёс / Н. Міхалевіч // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2010. — 17 лют. — С. 2.

## АБПАЛЕНЫ ВАЙНОЮ ЛЁС

Аляксандр Траццякоў, Павел Тарасевіч, Сяргей Махонь, Андрэй Кеда. Гэтыя чатыры хлопцы вучыліся ў адным класе Докшыцкай школы і сталі ўдзельнікамі афганскай вайны. Першым пайшоў выконваць інтэрнацыянальны абавязак Саша Траццякоў. Адпраўлялі яго ўсім сваім дружным класам. Затым сустракалі. Андрэй Кеда таксама быў у ліку тых, хто сустрэў аднакласніка. Пакуль Андрэй закончыў Мінскі энергетычны тэхнікум, Саша адслужыў. Сустрэліся радасна, сціснулі адзін другога ў абдымках. Саша тады сказаў:

– Пасля той школы жыцця, што прайшоў я, зычу і табе, Андруха, трапіць у Афган.

– Я буду там, – запэўніў сябра Андрэй.

Шмат чакаць напрарочанага не давялося. Пасля прызыву на тэрміновую службу, а было гэта ў Ленінградзе (Андрэй па размеркаванні трапіў у легендарны горад), яго накіравалі служыць у Туркменію, а калі дакладней, то туды толькі на паўгода, у вучэбку. Пасля яе сяржант тэрміновай службы Андрэй Кеда разам з такімі ж юнакамі накіроўваецца ў Кабул.

Самалёт прызямліўся, і час стаў адлічваць новы перыяд жыцця. Новая эпоха ўчарашнім бестурботным юнакам нічым не нагадвала былога, што ў хвіліну засталося далёка ззаду. Страляніна, грукат, вогнішча, разруха, непарадак:.. Хацелася плакаць, заплюшчыць вочы, а адплюшчыўшы іх, бачыць звычайныя краявіды, дзе пануе лад, спакой, цішыня... Да звычайнай цішыні было яшчэ амаль паўтара года.

У Кабуле сяржанту Кеду была магчымасць стаць намеснікам камандзіра ўзвода дэсантна-штурмавога батальёна (цяпер А. Р. Кеда нават крыху шкадуе, што адмовіўся). Малады воін па-хлапецку спытаў, ці ёсць месца ў батальёне сябру, што разам з ім пачынаў працаваць, разам прызываўся ў армію, а затым у адной вучэбцы набіраўся салдацкай вартасці. Месца сябру не знайшлося, а таму і ён адмовіўся. Салдаты-сябрукі былі накіраваны ў асобны рамонтна-ўзнаўленчы батальён. Галоўным абавязкам батальёна было суправаджаць калоны з грузам. Андрэй Кеда ў ролі намесніка камандзіра ўзвода нёс асабістую адказнасць. Хто ведае, што значыць прыцягваць да сябе ўвагу? А пайсці першым і за сабой весці неабстраляных ваяк? А хто зведаў перапад тэмпературы ад дзікага холаду да невыноснай спякоты? Узвод у складзе 12 чалавек, у якім служыў сяржант Кеда, дыслацыраваўся на перавале Саланг, самай высокай кропцы, якая злучала два бакі Афганістана. На адлегласці аднаго тыдня руху ў ваенны час люты холад межаваў з гарачынёй. Праўда, гарачыня была не толькі ад сонечных прамянёў. Хоць Андрэй Расціслававіч і гаворыць, што трапіў у Афганістан у добры перыяд, практычна перад вывадам савецкіх войскаў, спазнаць кошт жыцця паспеў.

Пасля службы Андрэй Кеда вярнуўся ў Ленінград. Яго чакалі. За ім было замацавана рабочае месца, была ленінградская прапіска і пакой у інтэрнаце – працуй і жыві ў такім цудоўным горадзе. Толькі Андрэю захацелася на радзіму, у маленькі гарадок Докшыцы, дзе жылі бацькі, радня, сябры, знаёмыя. А ўвогуле, хацелася туды, дзе цёпла і ўтульна, дзе перажытае забудзецца хутчэй.

– Андруха, ты?! Жывы? А мне напісалі, што ты загінуў у Афгане, – пачуў узбуджаны голас былога аднакурсніка па тэхнікуме дэмабілізаваны Алег. У той час актыўна развіваліся рыначныя адносіны, і хлопец з Нясвіжа прыехаў гандляваць у Докшыцы, дзе і сустрэўся з Кедам.

Што можа быць больш радасным, чым жыццё? Той, хто бачыў сваімі вачамі смерць, адчуваў зямлю, якая, здавалася, уцякае з-пад ног, хто ведае, як у спякоту бяжыць мароз па плячах, а ў холад па спіне цячэ пот, той не хоча іншага шчасця, чым жыць на мірнай зямлі.

**Н. Міхалевіч**